**УДК 82.09**

# НАВАТАРСТВА І ПЕРАЕМНАСЦЬ ТРАДЫЦЫЙ У ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЯЗЭПА ПУШЧЫ

***Т.Р. БАГАРАДАВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аналізуецца паэтычная спадчына беларускага аўтара Язэпа Пушчы. Вершы і паэмы адметнага майстра слова доўгі час не перавыдаваліся ў сувязі з тым, што паэт быў беспадстаўна абвінавачаны і адпраўлены ў высылку. Цудам застаўся жыць. Пасля вяртання жыў і працаваў у Мінску. Працягваючы пісаць, выкарыстоўваў каноны святочнай паэзіі: магчыма, з мэтай застацца ў жывых і зноў не быць рэпрэсіраваным. У творчай спадчыне Язэпа Пушчы сустракаецца разнастайная жанравая палітра: ад ранніх медытацый да санетаў і паэм. Сярод твораў дамінуе інтымная, пейзажная і грамадзянская лірыка.*

**Уводзіны.** Язэп Пушча (1902–1964) – сапраўднае прозвішча Іосіф Паўлавіч Плашчынскі – з'явіўся прадстаўніком хвалі маладых беларускіх аўтараў, якая прыйшла ў літаратуру пасля Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі, Алеся Гаруна. Язэп Пушча ўваходзіў у склад аўтараў так званай «вернутай» (па-іншаму – рэпрэсаванай) літаратуры. Тонкі лірык, эксперыментатар у галіне вобразнасці, рытмікі, мелодыкі. Псіхолаг, які мог перадаць найтанчэйшыя зрухі чалавечай душы. Беларускі крытык і перакладчык. Паэт трапіў пад сталінскія рэпрэсіі. Пасля вяртання на Радзіму, у перыяд хрушчоўскай адлігі і частковай дэмакратызацыі жыцця, Язэп Пушча працягваў пісаць вершы, прасякнутыя аптымізмам і верай у новае – магчыма, з мэтай выжывання ў няпростых умовах існуючай палітыкі.

Лёс пісьменнікаў, што ўваходзілі ў беларускую літаратуру напрацягу 1920-х гадоў, быў няпросты. 1920-я гады ў гісторыі развіцця літаратуры – гэта час станаўлення мастацтва, якое мела на мэце стварэнне новага, нетрадыцыйнага, авангарднага. Ацэнка паэзіі 1920-х гадоў доўгі час была прасталінейнай і схематычнай: калі мастак славіў рэвалюцыю, перамогу працоўных мас, тады яго паэзія лічылася ўзорнай. У адваротным выпадку аўтар мог быць абвінавачаны ў апалітычнасці.

**Асноўная частка.** Ранні перыяд творчасці Язэпа Пушчы выразна пазначаны стылістычнымі канцэпцыямі літаратурнага аб'яднання «Маладняк», якое дэкларавала каноны ўрачыстай, радаснай, святочнай паэзіі. Многія з паэтаў пакалення Язэпа Пушчы нарадзіліся ў вёсцы і спазналі няпростае сялянскае жыццё. У аўтабіяграфіі аўтар напісаў: «Рана, з дзіцячых гадоў, стаў пастушком, узыход часта сустракаў на выгане разам з каровамі; я слухаў у полі і чуў, як раніца рыкае. Гэты вобраз пазней увайшоў у маю паэзію» [1]. Акрамя таго, адпаведная тэматыка і ўжыванне адметных вобразных сродкаў тлумачыцца словамі самога аўтара: «Асабліва ў часе жніва захаплялі мяне мелодыі жніўных песень, якія, здавалася, коцяцца і коцяцца з шумам спелых жытніх каласоў у чыстыя блакітныя далі. Нездарма ж гэта матывы маёй ранняй лірыкі» [1]. На думку В.А. Максімовіча, адной з акалічнасцей, што «абумовіла наяўнасць у ранняй лірыцы Язэпа Пушчы імажынісцкай вобразнасці і стылістыкі, стала захапленне сялянскай тэматыкай і жніўнымі песнямі» [2, с. 13].

Такім чынам, пачатковая творчасць паэта пазначана стварэннем узнёслай паэзіі з ярка выражаным метафарычным пачаткам. Напрыклад, верш «Рэчанька не спіць» (1922):

Рэчанька не спіць, светлая бяжыць.
Смутак не імжыць, і ахвота жыць [1].

Адметнасць таленту паэта можна адзначыць ужо ў пачатковай творчай спадчыне. Аналізуючы раннія творы Язэпа Пушчы, нельга не пагадзіцца з думкай М. Яроша, які сцвярджаў, што «маладому паэту досыць часта здраджваў мастацкі густ» [3, с. 56]. Аднак Язэп Пушча не толькі ішоў услед за новай мастацкай традыцыяй. Ён ствараў арыгінальныя творы з ярка выражаным індывідуальным пачаткам.

Напрыклад, у вершы «Дажынкавае» (1924) паэт у сваіх успамінах аддае перавагу Беларусі перад рэвалюцыяй:

Беларусь гэтаксама ўспомню,
А болей? Ну, што яшчэ болей?
Рэвалюцыі хіба мопомнік.
Атулены заравам бой [1].

Першыя публікацыі ў друку з'яўляюцца ў 1922 годзе. Хутка выходзіць кніга лірыкі Язэпа Пушчы з заканамернай назвай «Раніца рыкае» (1922). Тым часам даводзіцца працягваць вучобу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (1925–1927), далей, пасля пераводу, – у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце, дзе ў 1929 годзе скончыў чатыры курсы.

Пасталеўшы, паэт мяняе погляды на задачы мастацтва. Не паэзія, створаная на руінах літаратуры, а творчасць, пабудаваная па прынцыпах традыцыйнага, становіцца асновай светаўспрымання аўтара. Адзін

за адным выходзяць зборнікі паэзіі «Vita» (1926), «Дні вясны» (1927), «Песні на руінах» (1929), якія сведчаць пра паглыбленні маральна-этычных і палітычна-сацыяльных уяўленняў аўтара. Узрастаюць аўтарскія патрабаванні да мастацтва слова. Паэт пакутуе ад адзіноты, трывожыцца за лёс Бацькаўшчыны і беларускага народа.

Хутка наступіў час канфлікту з былымі паплечнікамі-«маладнякоўцамі». Пасля аўтар уступае ва «Узвышша», імкнецца ствараць наватарскае ў вобразна-выяўленчым плане мастацтва, павышае культуру творчасці. Будучы ў аб'яднанні, паэт імкнецца развіваць традыцыйную культуру, беручы за эталон пошукі Сяргея Ясеніна. Вульгарна-сацыялагічная крытыка абвінавачвае аўтара ва ўсіх грахах: упадніцтве, песімізме, прыклейвае ярлык нацдэма.

Рускія імажыністы, да якіх адносіўся Сяргей Ясенін, адмаўлялі значэнне зместу мастацкага твора. Для іх мастацкі твор з'яўляўся не сістэмай, а хаатычным наборам вобразаў. Для паэтаў-імажыністаў была ўласціва пагоня за ўскладненай метафарай, нават адмаўленне ад граматычных правіл, парушэнне законаў метрыкі.

Пазней, калі Язэп Пушча стаў актыўным паэтам, Сяргей Ясенін адышоў ад арганізацыі, пэўна, адчуваючы яе ідэйна-творчую вузкасць. А для маладога паэта Сяргей Ясенін і надалей заставаўся самым таленавітым з імажыністаў. Ужо ў ранніх вершах Язэпа Пушчы заўважаюцца сляды ўплыву Сяргея Ясеніна:

Беланогі, расчухраны месяц
Лявоніць у лісці кляновым.
Мне чупрыны не хочацца звесіць
Ў гэты вечар аўсяна-зялёны.
Я пайду сінявою мурожнай
Да начлежнікаў, хлопцаў буяных,
Хай прыгорне мяне вербалоззе,
Бо я хмелем сягонняшнім п'яны (1924) [4].

Для маладога паэта характэрнае шматлікае ўжыванне квяцістых метафар, вобразнасці, характэрнай рытмікі верша, што з'яўляецца данінай творчасці Сяргея Ясеніна. У апошняга знаходзім:

Вечер черные брови насопил.
Чьи-то кони стоят у двора.
Не вчера ли я молодость пропил?
Разлюбил ли тебя не вчера? (1923) [5].

Ранняя лірыка Я. Пушчы цікавая эксперыментальным пошукам індывідуальных славесна-выяўленчых сродкаў. Паэт апісвае прыгожае, нібы канстатуе ўбачанае, адначасова закранаючы адвечную тэму мастака і мастацтва пры дапамозе адметных вобразаў:

На стромкім усхоне
Стаяў задуменны мастак.
Шум гонкае хвоі
Навеяў таемнасць і страх.
Глянуў на дол
Ён маўкліва, −
Сціснуўся боль:
Сплямлена кроўю каліна! (1926) [4].

Сам Язэп Пушча пісаў: «Знаходжуся пад моцным уздзеяннем вобразнасці народнай паэзіі, захапляючыся Сяргеем Ясеніным. Шукаю новую і светлую сцежку ў паэзіі. Шырока карыстаюся вобразам, смелай метафарай, імкнуся надаць новае гучанне рыфме» [6].

Пра мастацкі ўплыў Сяргея Ясеніна кажуць і выкарыстаныя беларускім аўтарам шматлікія метафары, у тым ліку, сялянскага кшталту: «...туліцца жнівень пад пуняй з ношкай аўсянай саломы...», «…ветры, пужлівыя коні, рвуцца ў мурожныя далі…», «…на *сіні* выган выганяе сонца пасвіць дзень», «…сцелецца новы Шлях Млечны! – вечарам зораста-*сінім*…» і інш. Варта адзначыць і дамінантнае выкарыстанне блакітнага і сіняга колеру пры апісанні прыродных з'яў, што таксама нагадвае лірыку рускага паэта-імажыніста. У Сяргея Ясеніна чытаем:

Хорошо бродить среди покоя
*Голубой* и ласковой страны [5].

Або:

На душе холодное кипенье
И сирени шелест *голубой* [5].

А таксама:

*Синий* туман. Снеговое раздолье,
Тонкий лимонный лунный свет [5].

Уплыў паэзіі Сяргея Ясеніна ў творчасці маладога беларускага аўтара спачатку быў чыста знешні. Язэп Пушча яшчэ не змог пранікнуць у глыбінную сутнасць творчасці рускага паэта і яе лепшыя мастацкія набыткі. Лічачы сябе паэтам сялянскім, Язэп Пушча імкнуўся засвоіць асаблівасці моўна-выяўленчых сродкаў ясенінскай творчасці. У асобных выпадках ён, арыентуючыся на паэтыку Сяргея Ясеніна, змог стварыць арыгінальныя вобразы: «вецер расой ахрысціў поплывы ў сіні шырокай // Песціцца сонца ў трысці, // Ветрась цалуючы ў шчокі…», «снег пульхны жуюць палозы» і інш. Але часцей за ўсё гэта наследаванне ішло па лініі не самага лепшага, а таго, што ў адметнага рускага паэта было неарганічным і крыклівым.

Славутыя «Лісты да сабакі» (1927) (зноў жа, даніна ясенінскай творчасці) напісаныя паэтам у пару вучобы ў Ленінградскім універсітэце і надрукаваныя ў складзе сямі вершаў пад агульным загалоўкам «Асеннія песні» ў часопісе «Узвышша». Паводле У. Калесніка, «Трагедыйнасць перажыванняў аўтара і лірычнага героя яго твораў выдавалася за варожасць, здраду сацыялістычным ідэалам» [7, с. 43]. Вульгарызатарская крытыка абвінавачіла верш у пагардзе да савецкай рэчаіснасці, назваўшы «творам буржуазнага неарамантызму». Сама назва верша «Лісты да сабакі» ўспрымалася як выклік часу і грамадству. Нават некаторыя сябры бачылі ў гэтым вершы пэўную «хуліганістасць» яго аўтара. На самой справе «Лісты да сабакі» – гэта «лісты да дому» і выказванне грамадзянскай пазіцыі аўтара:

Жыві, жыві, знаць, дома лепей;
Услухвайся ў таемны шум і шэпт,
Чужыя людзі ходзяць каля склепа.
Пільнуй! Цябе цалуе твой Язэп [8].

Варта сказаць, што захапленне творчасцю Сяргея Ясеніна было знешняе. Унутраная сутнасць вершаў заставалася індывідуальнай. Паступова паэт адмаўляецца ад стракатых і часам недарэчных вобразаў, пазбаўляючыся і ўплыву рускага аўтара. Максім Гарэцкі ў артыкуле «Беларуская літаратура пасля «Нашай Нівы» адзначаў: «Шуканне і навізна выявіліся ў беларускай літаратуры пасля Кастрычніка, найперш у імажынізме. Але... беларускі імажынізм неяк сам сабою знік, як нешта асобнае, і перайшоў, напрыклад, у Пушчы, у зусім здаровую і патрэбную творчасць арыгінальных слоў і вобразаў» [9, с. 92].

У 1957 годзе Язэп Пушча наведаў родныя мясціны паэта, напісаў верш «Сяргею Ясеніну», дзе выказаў захапленне прыродай рускай зямлі, сваю павагу да славутага яе сына:

Спяваў ад сэрца ты Расіі,
І ў сэрцахголас твой не сціх.
Ішоў свавольны, светла-русы
І маладой вясне быў рад.
Любілі мы на Беларусі
Твой рускі ў песнях жар і лад [6].

У ранняй творчасці маладога беларускага аўтара заўважаецца плён традыцый Я. Коласа і яго ўстойлівай сялянскай грунтоўнасці. Карані маралі лірычнага героя бяруць пачатак з глыбінь народнай этыкі. Перш за ўсё гэта выявілася ў аўтарскай канцэпцыі жыцця вёскі і ў праблематыцы вершаў зборніка «Раніца рыкае». У гэтай паэзіі дамінуе любоў да радзімы, вясковай хаты, з якой нядаўна выйшаў і якая заўжды кліча да сябе:

Раніца
ў полі рыкае
ў зялёную сінь.
Раніць
грудзі рака ёй. –
Вісне вясны каласнік [1].

У вершах адчуваецца змястоўная, эмацыянальная блізкасць з народнымі песнямі, з сутнасцю народных уяўленняў пра свет.

Паэзія Язэпа Пушчы блізкая і да лірыкі Я. Купалы сваім паглыбленнем у эмацыянальны інтымны свет лірычнага героя. У творчасці аўтара дамінуе каларыт пейзажнай і інтымнай лірыкі. У гады вучобы ў Мінскім рэальным вучылішчы з 1918 па жнівень 1921 года паэт знаёміцца з творчасцю Я. Купалы. Паводле слоў самога аўтара, гэта «абудзіла...нацыянальную свядомасць» [10, с. 68]. У паэзіі Язэпа Пушчы падабенства да Я. Купалы будзе выражана найперш у адмаўленні ад абстрактна-планетарнай вобразнасці, уласцівай, бадай, усім раннім вершам маладнякоўцаў, і набліжэнне да насычанай жыццёвай сілай і яркасцю каларытнасці на пазнейшых этапах жыцця і творчасці. Як і Я. Купала, Язэп Пушча пераследаваўся ўладамі і крытыкай за неадпаведнасць яго творчасці тагачасным канонам пралетарскай літаратуры, абвінавачваўся за быццам бы адарванасць ад вёскі.

Вымушаны адрыў ад Радзімы таксама паўплываў на настрой аўтара «Лістоў да сабакі» (1927), «Асенніх лістоў» (1927), паэмы «Цень Консула» (1928) і іншых глыбока трагедыйных твораў. Трэба ад-

значыць, што ў зборніку «Песні на руінах» (1929), паэме «Крывавы плакат» (пазнейшая назва «Крывавы год», 1930) трагедыйнае пачуццё дамінуе. Светлы настрой канчаткова выцясняецца змрочнымі вобразамі-сімваламі гора, бяды, няшчасця: «змрок вячорны», «заплаканы вечар», «нагата зямлі», «дзікі голас», «крывавая сляза», «змяіныя вякі», «чорная дарога», «укрыжаваная радзіма» і інш. Праўда, у паэме «Сады вятроў» (1930) паэт пастараецца «раскрыць» сваю пазіцыю, глыбінна выказаць канцэптуальнае разуменне жыцця і паэзіі вуснамі паэта-рамантыка Грыміцкага, які з'яўляецца вобразным увасабленнем фігуры самога аўтара:

У іхнім шуме – гнеў паўстання,
Імчанне ў полі цягніка,
Агні юнацкага кахання
І помсты чорная рука [4].

Яго літаратурныя перакананні – гэта і адказ афіцыйнай крытыцы. Можна меркаваць, што асабістая трагедыя, якую перажылі Я. Купала і Язэп Пушча ў 1920-я гады, зблiжае іх як мастакоў слова, і як простых людзей.

У 1930 годзе былі здадзены ў друк, але ў сувязі з арыштам не ўбачылі свет зборнікі Язэпа Пушчы «Мой маніфэст» і «Грэшная кніга».

Такім чынам, даваенная паэзія Язэпа Пушчы засведчыла неардынарнасць тэматычных і вобразна-выяўленчых пошукаў аўтара. Паэт захапіўся новай паслярэвалюцыйнай рэчаіснасцю, але прадказаў трагічную пару ў лёсе грамадства. Даволі маштабнай і разнастайнай уяўляецца жанравая палітра даваеннай творчасці таленавітага майстра: стваракоцца глыбокія медытацыі, адначасова паэзія напоўнена публіцыстычнымі «маладнякоўскімі» заклікамі. Творчасць Язэпа Пушчы дадзенага перыяду ў цэлым надзвычай псіхалагічная. У ёй прысутнічае рамантычная напоўненасць.

Пасля рэабілітацыі аўтар жыў у Мінску. Быў нанава прыняты ў Саюз пісьменнікаў. З'яўляюцца кнігі аўтара: вершаваная казка «На Бабрыцы», зборнікі «Вершы і паэмы», «Пачатак легенды». Ужо пасля смерці пісьменніка выходзяць у свет «Вершы і паэмы» (1968), «Сады вятроў» (1982), двухтомнік 1990-х гадоў. Паступова амаль уся спадчына паэта была выдадзена.

У творчасці Язэпа Пушчы1950–60-х гадоў, адбыліся прыкметныя змены. У ідэйна-тэматычным і пафасным плане яна стала больш аптымістычнай, хоць дапушчальна, што гэты аптымізм быў у значнай ступені вымушаны. Многія з вершаў таго часу ўяўляюць сабой гімны, песні, заздраўныя тосты ў гонар вяртання на Радзіму, сустрэчы з сябрамі. Сапраўдная высокая ў мастацкіх адносінах паэзія ў «позняга» Язэпа Пушчы назіраецца ў вершах аб прыродзе, да якой ён дакрануўся пасля вяртання ў родны край і якую цяпер аўтар можа параўнаць з рускай і экзатычнай (паўднёвай і сібірскай). У вершах падобнага тэматычнага зместу – «Кіпарысы» (1955), «Салавей», «Восень» (абодва – 1956), «Лета» (1957) – шмат яркіх мастацкіх дэталей. Язэп Пушча піша пра прыроду ў форме санета: іх у паэта некалькі дзесяткаў. Санеты аб прыгажосці прыроды, аб вернасці роднаму краю, неўміручасці працы і мастацтва.

Як і некаторыя іншыя беларускія паэты, высланыя на Поўнач і ў далёкую Сібір (у першую чаргу, Станіслаў Шушкевіч, Мікола Хведаровіч, Сяргей Грахоўскі), Язэп Пушча стварыў арыгінальную паэзію пра чужы для беларусаў экзатычны край – «Дзекабрыстам» (1933), «Шумі, уральская тайга» (1935). Даволі яркімі атрымаліся ў яго і вершы аб моры («На ўзмор'і», «Кіпарысы», «Мора» (усе – 1955). У дадзеных творах можна прасачыць традыцыю А.С. Пушкіна: веліч, легендарнасць, урачыстасць, унутраная засяроджанасць на галоўным – неабсяжнасці, шырыні і вечнасці марской стыхіі. У вершы «Мора» знаходзім:

З узнятаю рукой да сонца
Я на скале марской стаю.
Люблю цябе я шчыра, моцна,
Як песню першую сваю.
Не ведаюцьплыўцыпакоры,
Каліідуцьу смелы рэйд.
Люблю бязмежныяпрасторы,
Адвечны гул тваіх легенд [4].

У апошні перыяд жыцця Язэп Пушча пісаў паэмы. У іх аснове ляжаць падзеі Вялікай Айчыннай вайны, якую паэт на свае вочы не бачыў, а толькі перажыў, вывучыў па дакументах. Таму і атрымаліся яны – «Бор шуміць» (1957) і «Людвіся» (1959), – хоць і поўныя трагізму, але эскізныя, са слаба акрэсленымі характарамі. Варта адзначыць, што паэт пайшоў услед за традыцыяй апісання ваенных падзей, таму самымі ўдалымі момантамі аказаліся сцэны апісання мірнага жыцця і пейзажныя малюнкі – тое, што добра ведаў сам аўтар, што яму заўсёды ўдавалася.

**Заключэнне.** На нашу думку, Язэп Пушча – мастак арыгінальны і непаўторны. Тое, што напісаў ён «у росквіце свайго юнацтва, усё яшчэ актуальна і мае поўную сілу і сягоння» [11, с. 13]. Адарваны ад Беларусі, аўтар пісаў мала. І толькі пасля вяртання на радзіму ён стварыў вершы мажорнай тэматыкі. Пасляваенная лірыка паэта вызначаецца аптымістычным настроем. Асноўныя яе матывы – любоў да Радзімы, шматгалоссе прыроды, услаўленне працоўнага энтузіязму. Па словах М. Мішчанчука: «Гэтая лірыка лёгка клалася на музыку. Песні на вершы Язэпа Пушчы напісалі І. Бараноўская, П. Падкавыраў, Ю. Семяняка і іншыя» [12]. Пачаўшы пісаць традыцыйныя творы пейзажнай лірыкі, выяўляючы гарманічны і цэласны настрой, аўтар змог спалучыць класічную традыцыю і выпрацаваць арыгінальныя формы адлюстравання рэчаіснасці, заклаўшы літаратурныя каноны.

ЛІТАРАТУРА


1. Біяграфія Язэпа Пушчы // Мая Беларусь [Электронны рэсурс]. – 2007. – Рэжым доступу: http://www.belsoch.org/-pg=biograph&bio=8&pstr=7.htm. – Дата доступу: 30.07.2014.
2. Максімовіч, В.А. Шыпшынавы край: Старонкі беларускай літаратуры 20 – 30-х гадоў XX стагоддзя / В.А. Максімовіч. – Мінск: УП ІВЦ Мінфіна, 2002. – 660 с.
3. Ярош, М. Беларуская савецкая лірыка / М. Ярош, М. Бечык. – Мінск: Народная асвета, 1979. – 350 с.
4. Язэп Пушча // Вершы [Электронны рэсурс]. – 2008. – Рэжым доступу: http://www.vershy. ru/content/mne-chupryny-ne-khocha. – Дата доступу: 01.08.2014.
5. Есенин, С. Стихотворения и поэмы / С. Есенин. – М.: Детская лит., 1969. – 100 с.
6. Язэп Пушча // Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. – 2009. – Рэжым доступу: http://mapyourinfo.com/wiki/be.wikipedia.org. – Дата доступу: 01.08.2014.
7. Калеснік, У. Тварэнне легенды / У. Калеснік. – Мінск: Выш. шк., 1987. – 319 с.
8. Пушча, Я. Лісты да сабакі / Я. Пушча // Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. – 2008. – Рэжым доступу: http://knihi.com. – Дата доступу: 01.08.2014.
9. Гарэцкі, М. Беларуская літаратура пасля «Нашай Нівы» / М. Гарэцкі // Маладняк. – 1928. – № 4. – С. 92.
10. Мішчанчук, М.І. Лепш вольным птахам рэзаць шыр нябёсаў... Эвалюцыя творчасці Язэпа Пушчы / М.І. Мішчанчук. – Мінск: Народная асвета, 1995. – 334 с.
11. Хведаровіч, М. Песняю славіў жыццё / М. Хведаровіч // Полымя. – 1999. – № 5. – С. 215–221.
12. Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / рэдкал.: М. Мішчанчук (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1995. – Т. 5: Пушча Язэп. – 320 с.


*Паступіў 05.01.2015*

**INNOVATION AND CONTINUITY OF TRADITIONS IN THE POETIC HERITAGE OF JAZEP PUSZCZA**

***T. BAGARADAVA***

*The poeticheritageof Jazep Puszcza is analyzed. The works of the Belarusian poet haven’t been reprinted for a long time due to the fact that he was accused without reason and sent into exile. He miraculously survived. After his return Jazep Puszcza lived and worked in Minsk. He continued to write, using canons of festive poetry in order to stay alive and not to be exiled. The creative legacy of Jazep Puszcza includes diverse genres from early meditations to sonnets and poems. His works are mostly intimate, landscape, and civic lyric poetry.*